**Франклін Дэлана Рузвельт** (1882—1945) — дзяржаўны і палітычны дзеяч ЗША. У 1928 г. быў абраны губернатарам штата Нью-Ёрк, дзе распачаў шэраг рэформаў, якія апярэдзілі «новы курс». Зацвердзіў праграму страхавання беспрацоўных. Заяўляў, што дапамога беспрацоўным павінна разглядацца ўрадам не як дабрачыннасць, а як абавязак перад грамадствам. У 1932 г., будучы кандыдатам ад Дэмакратычнай партыі, атрымаў пераканаўчую перамогу на прэзідэнцкіх выбарах. Стаў 32-м прэзідэнтам ЗША. Абіраўся на гэты пост чатыры разы запар — адзіны выпадак за ўсю гісторыю ЗША, калі прэзідэнт быў абраны больш чым на два тэрміны насуперак традыцыі, якая склалася яшчэ з часоў Дж. Вашынгтона. У першыя сто дзён пасля інаўгурацыі прыняў значную частку законапраектаў «новага курсу». З 1933 па 1944 г. правёў 30 радыёперадач («Гутаркі ля каміна»), у якіх ён, не тоячы цяжкасцяў, казаў пра канкрэтныя меры па рэалізацыі «новага курсу», а таксама дзеянні ЗША падчас Другой сусветнай вайны. Карыстаўся падтрымкай практычна ўсіх пластоў насельніцтва.



# § 5. Барацьба супраць фашызму ў еўрапейскіх краінах напярэдадні Другой сусветнай вайны

*У якіх заходнееўрапейскіх краінах фашысты прыйшлі да ўлады? Якія прычыны гэтаму садзейнічалі?*

Умацаванне фашысцкіх рэжымаў у шэрагу краін паставіла еўрапейскую супольнасць перад неабходнасцю пошуку шляхоў і сродкаў барацьбы супраць фашызму. Найбольш значны ўнёсак у арганізацыю антыфашысцкага руху зрабілі левыя палітычныя сілы.

**Зацвярджэнне фашысцкага рэжыму ў Германіі.** Прыйшоўшы да ўлады і расправіўшыся са сваімі палітычнымі сапернікамі, нацысцкая партыя перайшла да ўмацавання фашысцкага рэжыму ў краіне. Фашысты ўсталявалі татальны кантроль над эканомікай і грамадствам. А. Гітлер здолеў хутка вывесці краіну з крызісу, ліквідаваць беспрацоўе і прыкметна павысіць узровень жыцця. Пасля гэтага ён пачаў узмоцнена рыхтавацца да заваявання абяцанай ім германскай нацыі «жыццёвай прасторы». Практычна ўсе галіны прамысловасці працавалі на будучую

Правообладатель Издательский центр БГУ

| Гады | Млрд марак | % адносна ўсіх выдаткаў | % адносна мірнай прадукцыі |
|---|---|---|---|
| 1932 | 0,6 | 8,2 | 1,1 |
| 1934 | 4,2 | 39,3 | 5,0 |
| 1936 | 10,3 | 59,2 | 11,2 |
| 1938 | 17,2 | 61,0 | 15,7 |
| 1940 | 58,1 | 78,0 | 40,0 |
| 1943 | 117,9 | 81,0 | 70,0 |

Выдаткі на ўзбраенне ў Трэцім рэйху

*Як называецца працэс нарошчвання дзяржавай ваеннай магутнасці? З якой мэтай Германія павялічвала выдаткі на ўзбраенне? Ці былі парушаны якія-небудзь рашэнні Версальскага мірнага дагавора?*




Беспрацоўе ў Германіі ў 1933—1939 гг. (тыс. чал.)

ваенную экспансію. Пры гэтым нацысцкая партыя абапіралася на падтрымку значнай часткі насельніцтва.

У 1935 г. па ініцыятыве А. Гітлера былі прыняты расісцкія законы. Цяпер грамадзянінам рэйха лічыўся толькі той, хто валодаў «нямецкай або роднаснай ёй крывёю». Законы былі накіраваны перш за ўсё супраць яўрэяў. Прадстаўнікі гэтай нацыянальнасці пазбаўляліся палітычных правоў, ім закрываўся доступ да публічных пасад, забараняліся шлюбы з немцамі. Фактычна яўрэі былі пастаўлены па-за законам. Пачалася іх ізаляцыя па нацыянальнай, «расавай» прымеце. У далейшым у дачыненні яўрэяў, а таксама цыганоў пачала праводзіцца палітыка фізічнага знішчэння.

Умацаванню фашысцкага рэжыму ў Германіі спрыяла эканамічная дапамога фінансавых і прамысловых колаў Вялікабрытаніі і ЗША. У канцы 1930-х гг. Англія стала гандлёвым партнёрам Германіі. У гэты ж час амерыканцы пачалі будаваць у Германіі буйны́я нафтаперапрацоўчыя заводы. З ЗША ў Германію таемна дастаўлялася сучаснае абсталяванне для авіяцыйных заводаў.

**Народны фронт у Францыі.** Пагроза фашызму ў Еўропе выклікала супрацу дэмакратычных сіл. Асабліва моцным ён быў у Францыі і Іспаніі.

У 1932 г. у Францыі да ўлады прыйшоў прагрэсіўны ўрад партый так званага

Высветліце, якім чынам Германія здолела вырашыць праблему беспрацоўя.

Правообладатель Издательский центр БГУ

левага блока на чале з радыкал-сацыялістамі. Фашысцкія групоўкі і арганізацыі разгарнулі актыўную барацьбу супраць камуністаў і сацыялістаў. У 1933—1934 гг. сітуацыя абвастрылася да мяжы. У Парыжы рэгулярна адбываліся сутычкі паміж правымі і левымі з ужываннем зброі.

6 лютага 1934 г. фашысцкія лідары арганізавалі ў Парыжы антыўрадавую маніфестацыю. Дэманстранты распачалі штурм парламента з мэтай дзяржаўнага перавароту. Паліцыя адкрыла агонь на паражэнне, і фашысты былі вымушаны адступіць. Такім чынам, спроба прыходу фашыстаў да ўлады ў Францыі сарвалася.

У 1935 г. у Францыі праходзілі масавыя антыфашысцкія маніфестацыі. Камуністы і сацыялісты сталі аб'ядноўвацца для сумесных дзеянняў. 14 ліпеня 1935 г. да гадавіны ўзяцця Бастыліі была арганізавана сумесная дэманстрацыя каля 500 тыс. чалавек на чале з кіраўніком камуністычнага руху Марысам Тарэзам, лідарамі сацыялістаў і радыкал-сацыялістаў Леонам Блюмам і Эдуардам Даладзье. Гэты дзень лічыцца датай заснавання кааліцыйнага аб'яднання ***Народны фронт***.

На парламенцкіх выбарах у маі 1936 г. Народны фронт атрымаў перамогу. Былі распушчаны і раззброены фашысцкія арганізацыі. Урад Народнага фронту на чале з сацыялістам Л. Блюмам пашырыў правы прафсаюзаў і сацыяльнае заканадаўства і правёў беспрэцэдэнтныя ў гісторыі Францыі сацыяльныя рэформы. Усталёўваўся 40-гадзінны працоўны тыдзень, стаў аплачвацца штогадовы адпачынак працягласцю 14 дзён. Былі ажыццёўлены нацыяналізацыя чыгунак, частковая нацыяналізацыя ваеннай прамысловасці, павялічаны падаткі на вялікія даходы, пастаўлены пад кантроль дзяржавы Банк Францыі. Аднак французскія фінансавыя колы сталі масава выводзіць капіталы за мяжу, што спрыяла росту інфляцыі. У 1937 г. французскую эканоміку ахапіў новы крызіс. Узровень прамысловай вытворчасці знізіўся да 70 % у параўнанні з 1929 г.

У гэты ж час першапачатковае адзінства партый у Народным фронце стала разбурацца. Прычынай таму паслужыла іх markednae стаўленне да праблем знешняй палітыкі, у прыватнасці, да пытання ўмяшання ў грамадзянскую вайну ў Іспаніі, якая разгарэлася ў 1936 г. Пасля падпісання Мюнхенскага пагаднення 1938 г. Народны фронт канчаткова распаўся. Да ўлады прыйшоў урад Э. Даладзье, які ліквідаваў сацыяльныя гарантыі, а ў 1939 г. забараніў дзейнасць Камуністычнай партыі.

Народны фронт быў першым вопытам знаходжання ва ўладзе ў Францыі сацыялістаў. Ён не змог выстаяць з прычыны ўздзеяння двух неспрыяльных фактараў: знешняга (вельмі напружанага міжнароднага становішча) і ўнутранага (процідзеянне фінансавай эліты). Аднак вопыт Народнага фронту стаў натхняльным прыкладам для левых партый у Францыі ў будучыні.

Правообладатель Издательский центр БГУ




Грамадзянская вайна ў Іспаніі (1936—1939)



Каля 35 тыс. добраахвотнікаў прыбылі з 53 краін у Іспанію для ўступлення ў інтэрнацыянальныя брыгады. Барселона. 1936 г.

**Народны фронт і грамадзянская вайна ў Іспаніі.** У 1931 г. у Іспаніі пала манархія. Да ўлады прыйшлі прыхільнікі рэспублікі. Кароль Альфонса XIII пакінуў краіну, але не падпісаў адмову ад трона. Часовы ўрад у чэрвені 1931 г. абвясціў Іспанскую рэспубліку. Парламент, у якім большасць месцаў займалі сацыялісты, прыняў антыклерыкальныя законы, канфіскаваў багацці Ордэна езуітаў. Усё гэта выклікала незадаволенасць правых, пачаўся вывад капіталаў з краіны. Актывізаваўся фашысцкі рух, які карыстаўся папулярнасцю ў каталіцкіх колах.

У лютым 1936 г. да ўлады ў Іспаніі прыйшоў урад *Народнага фронту* ў складзе сацыялістаў, камуністаў і левапэспубліканскіх партый. Усіх іх аб’ядноўвала ідэя барацьбы з фашызмам. Правыя, пацярпеўшы паражэнне на выбарах 1936 г., ажыццявілі ваенны мяцеж на чале з генералам ***Францыска Франка***.

У Іспаніі пачалася *грамадзянская вайна*, якая доўжылася з ***ліпеня 1936 г.*** па ***красавік 1939 г.*** Краіны Захаду ў дачыненні Іспаніі праводзілі *палітыку неўмяшання*. Такая нейтральная палітыка была выгадная франкістам, бо бяздзейнасцю заходніх дзяржаў скарысталіся фашысцкія Германія і Італія. Германія накіравала на дапамогу іспанскім фашыстам войскі колькасцю больш за 50 тыс. чалавек, а Італія —

Правообладатель Издательский центр БГУ



Лідары Камуністычнай партыі Іспаніі Далорэс Ібаруры і Хасэ Дыяс. 1936 г. Інтэрнацыянальнае прывітанне «Рот фронт» і лозунг «Но пасаран» («Яны не пройдуць») сталі сімваламі барацьбы з фашызмам

больш за 200 тыс. Іспанскіх антыфашыстаў падтрымлівалі СССР, Камінтэрн, Мексіка і ў пачатку вайны Францыя. З кастрычніка 1936 г. на баку рэспубліканцаў у Іспаніі ваявалі *інтэрнацыянальныя брыгады*, якія складаліся з замежных валанцёраў, пераважна камуністаў.

Увесну 1937 г. у Іспаніі адбылася кансалідацыя фашысцкіх сіл. Фашысцкую партыю ўзначаліў Ф. Франка, абвешчаны генералісімусам. Яму быў прысвоены тытул *каўдыльё* — правадыра іспанскага фашызму. У сакавіку 1939 г. фашысты здолелі ўзяць Мадрыд, а ўжо ў пачатку красавіка ўся тэрыторыя рэспублікі апынулася пад іх кантролем. Так ва ўладзе ў Іспаніі з дапамогай Германіі і Італіі ўмацаваўся фашысцкі рэжым Ф. Франка.

**Антыфашысцкі рух.** Антыфашысцкі рух у Еўропе ўяўляў рэальную сілу. Дзякуючы вулічным выступленням антыфашыстаў былі сарваны фашысцкія путчы ў Аўстрыі, Вялікабрытаніі і Францыі. Антыфашысты стварылі ваенізаваныя дружыны, якія маглі супрацьстаяць у вулічных сутычках фашысцкім. Антыфашысцкае супраціўленне ў Германіі ва ўмовах тэрору не набыло шырокага размаху. Сярод нямецкіх падпольных антыфашысцкіх арганізацый найбольш вядомая «Чырвоная капэла», створаная з дапамогай савецкай разведкі.

№ 4

Прыход фашыстаў да ўлады ў Германіі, узмацненне фашызму ў Еўропе вымусілі VII кангрэс Камінтэрна летам 1935 г. зацвердзіць новую стратэгію камуністычнага руху — стварэнне адзінага антыфашысцкага Народнага фронту. Ён павінен быў злучыць ідэалагічна разнастайныя сілы, аб'яднаныя непрыманнем фашызму. Гэта рашэнне Камінтэрна спрыяла супраціву фашызму ў міжнародным маштабе.

1. Прасачыце шлях, які прайшла Германія ад дэмакратычнай рэспублікі да таталітарнай дзяржавы.
2. У аснову нацысцкай ідэалогіі была пакладзена расісцкая тэорыя. Прывядзіце прыклады выяўлення расісцкай тэорыі ва ўнутранай палітыцы Германіі.
3. На аснове аналізу дзяржаўнага ладу Германіі, які склаўся ў 1933—1939 гг., вызначце характэрныя рысы таталітарнага рэжыму.
4. У якіх заходніх краінах стала магчымым аб'яднанне антыфашысцкіх сіл? Чаму? Якую форму набыло аб'яднанне левых сіл у гэтых краінах?

Правообладатель Издательский центр БГУ

**5.** Ахарактарызуйце грамадзянскую вайну ў Іспаніі. Чаму гэта вайна набыла міжнародны характар?
**6.** Прывядзіце прыклады барацьбы супраць фашызму ў Еўропе. У чым вы бачыце слабасць антыфашысцкага руху?

Чаму ў грамадзянскай вайне ў Іспаніі перамаглі франкісты, а не рэспубліканцы, якім, здавалася, дапамагаў і спачуваў увесь свет?

**Франсіска Франка Баамондэ** (1892—1975) — дыктатар Іспаніі. Служыў у Марока, дзе зарабіў рэпутацыю добрага афіцэра. Стаў у 23 гады самым маладым маёрам іспанскай арміі, а затым самым маладым генералам. У 1936 г. узначаліў ваенна-фашысцкі мяцеж супраць Іспанскай рэспублікі, які перарос у грамадзянскую вайну. У 1939 г. абвешчаны пажыццёвым каўдыльё іспанскай дзяржавы. Адначасова заняў пасты правадыра Іспанскай фалангі, старшыні Савета Міністраў і галоўнакамандуючага ўсімі ўзброенымі сіламі. Падчас Другой сусветнай вайны Іспанія засталася ў ліку дзяржаў, што не ваявалі. Нягледзячы на ціск Берліна, дыктатар адмовіўся абвясціць вайну Савецкаму Саюзу, абмежаваўшыся адпраўкай «блакітнай дывізіі» (больш за 18 тыс. добраахвотнікаў) на Усходні фронт.



# § 6. Міжнародныя адносіны ў 1930-х гг.

*1. Калі і з якой мэтай стваралася Ліга Нацый? 2. Чаму ў Германіі былі моцныя рэваншысцкія настроі?*

Хісткі мір Версальска-Вашынгтонскай сістэмы быў канчаткова разбураны ў 1930-я гг. пад уздзеяннем рэзкага абвастрэння міжнародных супярэчнасцяў у выніку сусветнага эканамічнага крызісу 1929—1933 гг.

**Крызіс і крах Версальска-Вашынгтонскай сістэмы.** Перагляд Версальскага дагавора Германія распачала яшчэ перад прыходам фашыстаў да ўлады. Спачатку яна дамаглася ад заходніх дзяржаў згоды на спыненне выплаты рэпарацый, а ў 1932 г. вырвала ў іх прызнанне прынцыпу «роўнасці ва ўзбраеннях».

Першым крокам гітлераўскага рэжыму на міжнароднай арэне быў выхад Германіі з Лігі Нацый у *1933 г.* Затым пачалася мадэрнізацыя яе ўзброеных сіл. У 1935 г. уводзілася ўсеагульная вайсковая павіннасць, быў прыняты сакрэтны закон «Аб абароне імперыі». Згодна з ім эканоміка краіны ставілася на службу ваенным інтарэсам.

Правообладатель Издательский центр БГУ